European Commission




# Ключавыя кампетэнцыі для навучання на працягу жыцця

#EUkeycompetences
#EuropeanEducationArea
#lifelonglearning

*Education and Training*

Manuscript completed in March 2019

Neither the European Commission nor any person acting on behalf of the Commission
is responsible for the use that might be made of the following information.

Luxembourg: Publications Office of the European Union, 2019

© European Union, 2019
Reuse is authorised provided the source is acknowledged.
The reuse policy of European Commission documents is regulated by Decision 2011/833/EU (OJ L 330, 14.12.2011, p. 39).
For any use or reproduction of photos or other material that is not under the EU copyright, permission must be sought directly from the copyright holders.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Print | ISBN 978-92-76-00475-2 | doi:10.2766/291008 | NC-02-19-150-EN-C |
| PDF | ISBN 978-92-76-00476-9 | doi:10.2766/569540 | NC-02-19-150-EN-N |

Прадмова 3
Перадумовы і мэты 4
Ключавыя кампетэнцыі 5
Пісьменнасць 6
Шматмоўная кампетэнцыя 7
Матэматычная кампетэнцыя і кампетэнцыі ў навуцы, тэхналогіі і тэхніцы 8
Лічбавая кампетэнцыя 10
Персанальная, сацыяльная кампетэнцыя і ўменне вучыцца 11
Грамадзянская кампетэнцыя 12
Прадпрымальніцкая кампетэнцыя 13
Дасведчанасць і здольнасць выяўляць сябе ў культурнай сферы 14
Падтрымка развіцця ключавых кампетэнцый 15
Падыходы да выкладання і навучання і навучальнае асяроддзе 15
Падтрымка педагогаў 16
Ацэньванне і праверка кампетэнцый 16



# Прадмова



Сучаснай моладзі неабходны разнастайны набор кампетэнцый для таго, каб знайсці задавальняючую іх працу і стаць незалежнымі, актыўнымі грамадзянамі. Павышэнне ўзроўню ключавых кампетэнцый з’яўляецца прыярытэтным напрамкам Еўрапейскай адукацыйнай прасторы, якую мы будуем разам з дзяржавамі-членамі, – прасторы, у якой уся моладзь павінна атрымліваць лепшую адукацыю і навучанне незалежна ад іх паходжання.

Нашы веды, навыкі і стаўленні з'яўляюцца асноўным фактарам павышэння інавацыйнага патэнцыялу ЕС, яго прадуктыўнасці і канкурэнтаздольнасці. Глабалізацыя, структурныя змены на рынку працы і хуткае развіццё новых тэхналогій патрабуюць ад нас развіцця і абнаўлення навыкаў, неабходных нам на працягу ўсяго жыцця. Крытычнае мысленне, медыяадукацыя і камунікатыўныя навыкі – вось некаторыя з патрабаванняў для поспеху ў сучасным свеце, які становіцца ўсё больш складаным. А таксама і лічбавыя навыкі разам з пісьменнасцю, матэматыкай і прыродазнаўчымі навукамі з'яўляюцца асновай для бесперапыннага навучання. Неабходна заахвочваць і развіваць інавацыі і прадпрымальніцтва, калі мы хочам, каб Еўропа канкурыравала ў сусветнай гонцы.

У той самы час нашы сістэмы адукацыі і навучання не адпавядаюць патрабаванням кожнага, і мы рызыкуем пакінуць людзей па-за межамі адукацыі. Апошняе даследаванне PISA выявіла павелічэнне колькасці тых, хто не дасягнуў неабходнага ўзроўню і гэта азначае, што прыкладна кожны пяты еўрапейскі вучань не ўмее пісаць, чытаць або рабіць матэматычныя вылічэнні на дастатковым узроўні. Гэта трывожныя вынікі, і нам неабходна зрабіць значна больш, каб іх змяніць.

Рэкамендацыя аб васьмі ключавых кампетэнцыях для навучання на працягу ўсяго жыцця, якая была прынятая ў маі 2018 года, – гэта важны крок наперад. Яна абнаўляе Рэкамендацыі 2006 года з улікам патрабаванняў свету, у якім мы жывем сёння. Яна нават пайшла далей. Недастаткова толькі апісаць неабходныя нам кампетэнцыі. Вось таму новая Рэкамендацыя дае рэкамендацыі і добрыя практычныя парады, якія дапамогуць нам дасягнуць нашых мэтаў.

Краіны павінны аказваць большую падтрымку выкладчыкам, трэнерам і педагогам. Ім патрэбна выйсці за межы прадметаў, дазволіць міждысцыплінальнае навучанне, больш супрацоўнічаць з бізнесам, развіваць сеткавае ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва з зацікаўленымі бакамі. Неабходна прапагандаваць прадпрымальніцтва, кожны вучань павінен мець хаця б адзін практычны вопыт прадпрымальніцкай дзейнасці падчас школьнай адукацыі. Акрамя таго, імкненні ААН у Мэтах устойлівага развіцця павінны ўкараніцца ў адукацыйную палітыку, навучанне і прафесійную падрыхтоўку. Усе гэтыя практыкі могуць падтрымаць развіццё кампетэнцый цяпер і ў будучым.

Я ўпэўнены, што гэта Рэкамендацыя будзе служыць карысным інструментам для тых, хто вызначае адукацыйную палітыку, а таксама для педагогаў, трэнераў і навучэнцаў, і стане гарантам таго, што ва ўсіх дзяцей і моладзі будзе магчымасць атрымаць адукацыю, якую яны заслугоўваюць. Я заклікаю ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу максімальна эфектыўна карыстацца ёй і супрацоўнічаць з намі з мэтай пабудовы сапраўднай Еўрапейскай адукацыйнай прасторы.

**Цібор Наўраксіс,**

**Еўрапейскі камісар па пытаннях адукацыі, культуры, моладзі і спорту**

# Перадумовы і мэты

Рада Еўрасаюза прыняла Рэкамендацыю па ключавых кампетэнцыях для навучання на працягу ўсяго жыцця ў маі 2018 года. Рэкамендацыя выдзяляе восем ключавых кампетэнцый, неабходных для самарэалізацыі грамадзян, для здаровага і ўстойлівага ладу жыцця, працаўладкавання, актыўнай грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнай інтэграцыі.

Рэкамендацыя з'яўляецца даведнікам для зацікаўленых бакоў у сферы адукацыі і навучання. Яна дае агульнае ўяўленне аб кампетэнцыях, неабходных сёння і ў будучым. Даведнік дэманструе эфектыўныя спосабы, якія будуць садзейнічаць развіццю кампетэнцый праз інавацыйныя падыходы да навучання, метады ацэньвання і падтрымку педагогаў.

Усе навучэнцы павінны цалкам раскрыць свой патэнцыял. З мэтай задавальнення іх разнастайных патрэб рэкамендацыя заклікае дзяржавы-члены забяспечваць якасную адукацыю і догляд за дзецьмі ранняга ўзросту, паляпшаць школьную адукацыю і забяспечваць выдатнае выкладанне, удасканальваць базавую і прафесійна-тэхнічную адукацыю і навучанне, а таксама мадэрнізаваць сістэму вышэйшай адукацыі.



* The Official Journal 2018/C 189/01:
https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/?uri=OJ%3AC%3A2018%3A189%3ATOC

# Ключавыя кампетэнцыі

Ключавыя кампетэнцыі – гэта адзінства ведаў, навыкаў і стаўлення.

• **Веды**
Веды складаюцца з паняццяў, фактаў і лічбаў, ідэй і тэорый, якія ўжо прыняты і якія падтрымліваюць разуменне ў пэўнай вобласці ці прадмеце.

• **Навыкі**
Навыкі разглядаюцца як здольнасць выконваць дзеянні і выкарыстоўваць існуючыя веды для дасягнення вынікаў.

• **Стаўленне**
Стаўленне апісвае схільнасць і настрой для дзеяння ці рэакцыю на ідэі, асобы або сітуацыі.

Ключавыя кампетэнцыі развіваюцца на працягу ўсяго жыцця ў фармальных, нефармальных і нетрадыцыйных формах навучання ў розных асяроддзях, уключаючы сям'ю, школу, працоўнае месца, суседства і іншыя суполкі.
Усе ключавыя кампетэнцыі лічацца аднолькава важнымі, і асноўныя прынцыпы адной кампетэнцыі будуць садзейнічаць развіццю другой. Напрыклад, такія навыкі, як крытычнае мысленне, уменне вырашаць праблемы, праца ў камандзе, камунікатыўнасць, творчы падыход, уменне весці перамовы, аналітычныя і міжкультурныя навыкі з’яўляюцца неад’емнай часткай кожнай з ключавых кампетэнцый.

**Спіс васьмі ключавых кампетэнцый:**

> **Пісьменнасць**
> **Шматмоўная кампетэнцыя**
> **Матэматычная кампетэнцыя і кампетэнцыі ў навуцы, тэхналогіі і тэхніцы**
> **Лічбавая кампетэнцыя**
> **Персанальная, сацыяльная кампетэнцыя і ўменне вучыцца**
> **Грамадзянская кампетэнцыя**
> **Прадпрымальніцкая кампетэнцыя**
> **Дасведчанасць і здольнасць выяўляць сябе ў культурнай сферы.**

# Пісьменнасць



**Пісьменнасць – гэта здольнасць ідэнтыфікаваць, разумець, выражаць, ствараць і інтэрпрэтаваць паняцці, пачуцці, факты і меркаванні ў вуснай і пісьмовай формах, выкарыстоўваючы візуальны, аўдыя-/ гукавы і лічбавы матэрыял у розных сферах і кантэкстах. Гэта азначае здольнасць камунікаваць і эфектыўна наладжваць зносіны з іншымі людзьмі ў адпаведнасці з сітуацыяй і прымяняючы творчы падыход.**
**Развіццё пісьменнасці з’яўляецца асновай для далейшага навучання і моўнага ўзаемадзеяння. У залежнасці ад сітуацыі пісьменнасць можа развівацца на роднай мове, на мове навучання і/або афіцыйнай мове краіны ці рэгіёна.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да пісьменнасці

### Веды

Гэтая кампетэнцыя азначае ўменне чытаць і пісаць, правільна разумець напісаную інфармацыю і, такім чынам, патрабуе ад чалавека веданне лексікі, асноў граматыкі і функцый мовы. Яна ўключае ў сябе веды пра асноўныя віды моўнага ўзаемадзеяння, пра шэраг мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў, а таксама пра асноўныя асаблівасці розных стыляў мовы і камунікатыўных сітуацый.

### Навыкі

Людзі павінны валодаць навыкамі як вусных, так і пісьмовых зносін у розных сітуацыях, а таксама ўмець кантраляваць і адаптаваць сваю ўласную камунікацыю ў залежнасці ад сітуацыі.

Гэтая кампетэнцыя таксама ўключае ў сябе ўменне адрозніваць і выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі, а таксама шукаць, збіраць і апрацоўваць інфармацыю, выкарыстоўваць дапаможныя сродкі, умець вусна ці пісьмова пераканаўча выказаць свае аргументы ў залежнасці ад кантэксту. Яна ўключае ў сябе крытычнае мысленне, уменне ацэньваць інфармацыю і працаваць з ёй.

### Стаўленне

Станоўчае стаўленне да пісьменнасці прадугледжвае схільнасць да крытычнага і канструктыўнага дыялогу, ацэнку эстэтычных якасцей і зацікаўленасць ва ўзаемадзеянні з іншымі. Гэта прадугледжвае ўсведамленне таго, што мова можа ўплываць на іншых, а гэта ў сваю чаргу патрабуе выкарыстоўваць мову пазітыўным і сацыяльна адказным чынам.

# Шматмоўная кампетэнцыя




**Гэтая кампетэнцыя азначае здольнасць карыстацца рознымі мовамі для камунікацыі належным чынам і эфектыўна. Яна шмат у чым падобна да асноўных навыкаў пісьменнасці і асноўваецца на ўменнях разумець, выражаць і інтэрпрэтаваць паняцці, думкі, пачуцці, факты і меркаванні ў вуснай і пісьмовай форме (разуменне мовы на слых, вуснае маўленне, чытанне і пісьмо) у шырокім спектры сацыяльных і культурных кантэкстаў у залежнасці ад патрэб і жаданняў чалавека. Моўныя кампетэнцыі ўключаюць у сябе гістарычны аспект і міжкультурныя кампетэнцыі. Што ў сваю чаргу абапіраецца на здольнасць з'яўляцца правадніком паміж рознымі мовамі і сродкамі масавай інфармацыі, як падкрэсліваецца ў Агульнаеўрапейскай канцэпцыі валодання замежнымі мовамі (Агульнаеўрапейскай канцэпцыі замежных моў). У залежнасці ад абставін яна можа ўключаць у сябе захаванне і далейшае развіццё навыкаў валодання роднай мовай, а таксама валодання дзяржаўнай мовай (мовамі) краіны.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Гэтая кампетэнцыя патрабуе ведання слоўнікавых адзінак і базавай граматыкі розных моў і дасведчанасці аб асноўных формах моўнага ўзаемадзеяння ў розных камунікатыўных сітуацыях. Веды пра грамадскія ўмовы, культурны аспект і варыятыўнасць моў таксама з'яўляюцца важнымі.

### Навыкі

Асноўныя навыкі для гэтай кампетэнцыі складаюцца са здольнасці разумець вусныя паведамленні, пачынаць, працягваць і завяршаць размову, а таксама чытаць, разумець і складаць пісьмовыя паведамленні на розных узроўнях валодання мовамі і ў залежнасці ад індывідуальных патрэб. Чалавек павінен умець карыстацца адпаведнымі моўнымі інструментамі і вывучаць мовы ў фармальных, нефармальных і нетрадыцыйных абставінах на працягу ўсяго жыцця.

### Стаўленне

Станоўчае стаўленне прадугледжвае павагу да культурнай разнастайнасці, інтарэс і зацікаўленасць рознымі мовамі і міжкультурную камунікацыю. Яно таксама азначае павагу да асобы кожнага чалавека, нягледзячы на яго ўзровень валодання мовай, у тым ліку павагу да роднай мовы асоб, якія належаць да меншасцей і/ці маюць міграцыйнае паходжанне, а таксама ўлічвае ўдзячнасць афіцыйнай мове (мовам) краіны як агульнаму сродку для ўзаемадзеяння.



# Матэматычная кампетэнцыя і…

**А** **Матэматычная кампетэнцыя – гэта здольнасць развіваць і прымяняць матэматычнае мысленне і разуменне з мэтай вырашэння шэрагу паўсядзённых праблем. Абапіраючыся на валоданне матэматычнымі паняццямі, акцэнт робіцца на працэсе, дзейнасці, а таксама ведах. Матэматычная кампетэнцыя ўключае ў сябе ў розны ступені здольнасць і жаданне выкарыстоўваць матэматычныя спосабы мыслення і матэматычныя мадэлі (формулы, выразы, графікі, дыяграмы).**

## Базавыя веды, навыкі і адносіны, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Неабходныя веды па матэматыцы ўключаюць у сябе добрае веданне лікаў, вымярэнняў, структур, асноўных матэматычных аперацый і мадэлей, разуменне матэматычных тэрмінаў і паняццяў, а таксама дасведчанасць у пытаннях, на якія матэматыка можа даць адказ.



### Навыкі

Чалавек павінен умець прымяняць асноўныя матэматычныя прынцыпы і працэсы пры вырашэнні паўсядзённых задач дома і на працы (напрыклад, фінансавыя навыкі), а таксама будаваць лагічны ланцужок. Чалавек павінен умець разважаць матэматычна, разумець матэматычныя доказы і мець зносіны на мове матэматыкі, умець карыстацца неабходнымі дапаможнікамі, у тым ліку статыстычнымі дадзенымі і графікамі, і разумець матэматычныя аспекты лічбавых тэхналогій.

### Стаўленне

Пазітыўныя стаўленне да матэматыкі абапіраецца на павагу да праўды і гатоўнасць шукаць прычыны і ацэньваць іх грунтоўнасць.

# …кампетэнцыі ў навуцы, тэхналогіі і тэхніцы




**В** **Кампетэнтнасць у навуцы азначае здольнасць і жаданне тлумачыць прыродныя з’явы, выкарыстоўваючы сукупнасць ведаў і метадалогій, уключаючы назіранне і эксперымент з мэтай выяўлення пытанняў, а таксама ўменне рабіць абгрунтаваныя высновы. Кампетэнцыі ў галіне тэхналогіі і тэхнікі – гэта прымяненне ведаў і метадалогій, якія неабходны для задавальнення патрэб і жаданняў чалавека. Кампетэнцыі ў навуцы, тэхналогіі і тэхніцы прадугледжваюць разуменне змен, выкліканых дзейнасцю чалавека, а таксама разуменне асабістай адказнасці кожнага за гэтыя змены.**

## Базавыя веды, навыкі і адносіны, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Асноўныя веды ў навуцы, тэхналогіі і тэхніцы ўключаюць у сябе разуменне галоўных законаў з’яў прыроды, асноўных навуковых паняццяў, тэорый, прынцыпаў і метадаў, тэхналогій, іх прадуктаў і працэсаў, а таксама разуменне ўплыву навукі, тэхналогіі, тэхнікі і дзейнасці чалавека на прыродныя змены. Дзякуючы гэтым кампетэнцыям людзі павінны лепш зразумець станоўчыя і адмоўныя бакі, а таксама рызыкі, звязаныя з уплывам навуковых дасягненняў і прымяненнем тэхналогій ў грамадстве (у дачыненні да прыярытэту каштоўнасцей, пытанняў маралі, культуры і працэсаў прыняцця рашэнняў і інш.)

### Навыкі

Навыкі ўключаюць у сябе разуменне навукі як працэсу пошуку і даследавання праз навуковыя метады, у тым ліку назіранні і кантралюемыя эксперыменты, уменне выкарыстоўваць логіку і рацыянальны падыход для праверкі гіпотэзы, а таксама гатоўнасць адмовіцца ад уласных перакананняў, калі яны супярэчаць новым эксперыментальным дадзеным. Яны ўключаюць у сябе здольнасць выкарыстоўваць тэхналагічныя інструменты і прылады, а таксама навуковыя дадзеныя з мэтай дасягнення выніку або для прыняцця абгрунтаванага рашэння ці фармулёўкі высновы. Чалавек таксама павінен адрозніваць асноўныя рысы навуковага даследавання і ўмець устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж з’явамі ў гэтым даследаванні.

### Стаўленне

Сутнасць гэтай кампетэнцыі ў станоўчым і крытычным ацэньванні, у клопаце пра этычныя праблемы, у падтрымцы бяспекі навакольнага асяроддзя і ў глабальным сэнсе пра ўплыў навукова-тэхнічнага працэсу на сябе, на сям'ю, на супольнасць і сусвет.



# Лічбавая кампетэнцыя



**Лічбавая кампетэнцыя прадугледжвае ўпэўненае, крытычнае і адказнае выкарыстанне лічбавых тэхналогій і ўзаемадзеянне з імі для навучання, працы і ўдзелу ў грамадскім жыцці. Яна ўключае ў сябе інфармацыйную граматнасць, уменне працаваць з базай дадзеных, камунікацыю і супрацоўніцтва, медыяграматнасць, стварэнне лічбавага кантэнту (у тым ліку праграмаванне), бяспеку (уключаючы лічбавую і кібербяспеку), пытанні, звязаныя з інтэлектуальнай уласнасцю, вырашэнне праблем і крытычнае мысленне.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Людзі павінны разумець, як лічбавыя тэхналогіі могуць падтрымліваць камунікацыю, творчасць і інавацыі, і асэнсоўваць іх станоўчыя і адмоўныя бакі. Яны павінны разумець асноўныя прынцыпы, механізмы і логіку, якія ляжаць у аснове лічбавых тэхналогій, ведаць асноўныя прынцыпы работы розных прылад, праграмнага забеспячэння і сетак. Людзі павінны крытычна ставіцца да праўдзівасці, надзейнасці і ўплыву інфармацыі і дадзеных, якія існуюць дзякуючы лічбавым тэхналогіям, а таксама ведаць пра прынцыпы законнасці і этыкі.



### Навыкі

Людзі павінны мець магчымасць карыстацца лічбавымі тэхналогіямі для падтрымкі іх актыўнай грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнай інтэграцыі, супрацоўніцтва з іншымі і творчасці ў дачыненні да асабістых, сацыяльных або камерцыйных мэт. Навыкі ўключаюць у сябе ўменні выкарыстоўваць, атрымліваць, выбіраць, ацэньваць, ствараць, праграмаваць і абменьвацца лічбавым кантэнтам. Людзі павінны ўмець карыстацца і абараняць інфармацыю, кантэнт, базы дадзеных і персанальныя дадзеныя, а таксама распазнаваць і эфектыўна ўзаемадзейнічаць з праграмным забеспячэннем, прыладамі, штучным інтэлектам і робатамі.

### Стаўленне

Узаемадзеянне з лічбавымі тэхналогіямі і зместам патрабуе рэфлексіўнага і крытычнага, але з іншага боку, зацікаўленага, адкрытага і перспектыўнага стаўлення да іх развіцця. Патрабуецца таксама этычна, бяспечна і адказна падыходзіць да выкарыстання гэтых сродкаў.

# Персанальная, сацыяльная кампетэнцыя і ўменне вучыцца



**Персанальная, сацыяльная кампетэнцыя і ўменне вучыцца – гэта здольнасць да самааналізу, да эфектыўнага размеркавання часу і інфармацыі, да канструктыўнага супрацоўніцтва з іншымі, а таксама ўменне быць устойлівым і кіраваць уласным навучаннем і кар'ерай. Яна ўключае ў сябе здольнасць спраўляцца з сумневамі і цяжкасцямі, уменне вучыцца, падтрымліваць свой фізічны і эмацыйны стан, а таксама фізічнае і псіхічнае здароўе, сачыць за сваім здароўем з перспектывай на будучыню, прадбачыць канфлікты і ўмець эфектыўна і канструктыўна спраўляцца з імі.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Для паспяховых міжасабовых зносін і сацыяльнага ўзаемадзеяння важна разумець нормы паводзін і правілы, якія прыняты ў розных грамадствах і асяроддзях. Персанальная і сацыяльная кампетэнцыя таксама патрабуе ведаў пра складнікі эмацыйнага і фізічнага здароўя і здаровага ладу жыцця. Акрамя гэтага, яна азначае, што чалавек сам можа выбіраць найбольш эфектыўныя для сябе стратэгіі навучання ў залежнасці ад уласных патрэб і можа самастойна шукаць розныя шляхі для развіцця гэтай кампетэнцыі, у тым ліку адукацыю, навучанне, магчымасці для кар'ернага росту і для ўласнай падтрымкі.

### Навыкі

Навыкі ўключаюць у сябе здольнасць бачыць свае магчымасці і засяродзіць увагу на іх, спраўляцца з цяжкасцямі, крытычна разважаць і ўмець прымаць рашэнні. Адначасова яны азначаюць здольнасць да навучання і ўменне працаваць як у камандзе, так і самастойна, арганізоўваць уласнае навучанне і старанна вучыцца, ацэньваць свае вынікі і дзяліцца імі з іншымі, пры неабходнасці шукаць падтрымку, эфектыўна кіраваць кар'ерай і быць сацыяльна актыўным чалавекам. Чалавек павінен быць устойлівым да стрэсаў і спраўляцца з сумневамі і цяжкасцямі. Акрамя гэтага, ён павінен умець весці канструктыўную размову ў розных абставінах, працаваць у камандзе і весці перамовы. Неабходным навыкам з'яўляецца і праяўленне талерантнасці, разуменне розных пунктаў гледжання, а таксама здольнасць ствараць сітуацыю поспеху і ўменне суперажываць.

### Стаўленне

Гэта кампетэнцыя асноўваецца на пазітыўным стаўленні да ўласнага сацыяльнага і фізічнага дабрабыту і на працэсе навучання на працягу ўсяго жыцця. Яе сутнасць праяўляецца ў супрацоўніцтве, мэтанакіраванасці і сумленнасці. Вельмі важна разумець, што ўсе людзі розныя, і пры гэтым неабходна паважаць патрэбы кожнага, ісці на кампраміс і не падтрымліваць стэрэатыпы. Чалавек павінен умець ставіць мэты і матываваць сябе, быць устойлівым і ўпэўненым у сваіх намерах быць паспяховым у навучанні на працягу ўсяго жыцця. Пазітыўнае стаўленне да рашэння праблем садзейнічае як працэсу навучання, так і здольнасці чалавека спраўляцца з цяжкасцямі і перашкодамі. Неад'емнай часткай з'яўляецца жаданне прымяняць набытыя веды і жыццёвы вопыт, а таксама зацікаўленасць у пошуку магчымасцей для навучання і развіцця ў розных сферах жыцця.

# Грамадзянская кампетэнцыя



**Грамадзянская кампетэнцыя – гэта здольнасць дзейнічаць як адказны грамадзянін і паўнавартасна ўдзельнічаць у грамадзянскім і грамадскім жыцці, абапіраючыся на сацыяльныя, эканамічныя, прававыя і палітычныя веды, а таксама сачыць за глабальнымі падзеямі.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

Грамадзянская кампетэнцыя грунтуецца на веданні асноўных паняццяў і з'яў, якія маюць дачыненне да асобы, груп, працоўных арганізацый, грамадства, эканомікі і культуры. Яна ўключае ў сябе разуменне агульных еўрапейскіх каштоўнасцей, пра якія гаворыцца ў артыкуле 2 Дагавора аб Еўрапейскім саюзе і ў Хартыі Еўрапейскага саюза аб правах чалавека. Вельмі важна сачыць за сучаснымі падзеямі, а таксама крытычна падыходзіць да нацыянальных, еўрапейскіх і сусветных гістарычных падзей. Акрамя гэтага яна ўключае ў сябе разуменне мэт, каштоўнасцей і галоўных ідэй грамадска-палітычных рухаў, у тым ліку пытанняў, звязаных з кліматычнымі і дэмаграфічнымі зменамі ў глабальным маштабе і прычын, якія іх выклікалі. Веды пра еўрапейскае супрацоўніцтва з аднаго боку і асэнсаванне ідэі пра полікультурны свет і нацыянальную ідэнтычнасць – вельмі важны складнік гэтай кампетэнцыі. Іншымі словамі, чалавек павінен разумець разнастайнасць культур і сацыяльна-эканамічных асаблівасцей еўрапейскіх дзяржаў і ведаць, якім чынам кожная дзяржава паасобку са сваёй нацыянальнай ідэнтычнасцю спрыяе развіццю ўсіх еўрапейскіх краін.

.



### Навыкі

Навыкі грамадзянскай кампетэнцыі – гэта здольнасць эфектыўна ўзаемадзейнічаць з іншымі ў дачыненні да пытанняў, звязаных з грамадскімі інтарэсамі, у тым ліку ўстойлівым развіццём грамадства. Важным навыкам з’яўляецца крытычнае мысленне і ўменне вырашаць праблемы, а таксама навыкі фармуляваць аргументаваныя доказы і канструктыўна ўдзельнічаць у грамадскай дзейнасці, у тым ліку ў прыняцці рашэнняў на розных узроўнях, ад мясцовага і нацыянальнага да еўрапейскага і міжнароднага. Уменне атрымліваць інфармацыю, крытычна да яе ацэньваць, узаемадзейнічаць з традыцыйнымі і новымі формамі сродкаў масавай інфармацыі і разумець ролю і функцыі СМІ ў дэмакратычным грамадстве – яшчэ адзін важны навык для гэтай кампетэнцыі.

### Стаўленне

Павага да правоў чалавека як асновы дэмакратыі з’яўляецца фундаментам адказнага і канструктыўнага стаўлення. Канструктыўны ўдзел прадугледжвае жаданне ўдзельнічаць у дэмакратычным працэсе прыняцця рашэнняў на розных узроўнях грамадскай дзейнасці. Вельмі важна мець пазітыўнае стаўленне да сацыяльнай і культурнай разнастайнасці, гендарнай роўнасці і сацыяльнай згуртаванасці, устойлівага ладу жыцця, прапагандаваць мір і не дапускаць гвалт, паважаць прыватнае жыццё іншых людзей і браць на сябе адказнасць за стан навакольнага асяроддзя. Цікавасць да палітычных і сацыяльна-эканамічных падзей, гуманітарныя навукі і міжкультурная камунікацыя – складнікі таго, што можа дапамагчы ў барацьбе са стэрэатыпамі, а пры неабходнасці пайсці на кампраміс і забяспечыць сацыяльную справядлівасць і роўнасць.

# Прадпрымальніцкая кампетэнцыя



**Прадпрымальніцкая кампетэнцыя – гэта здольнасць дзейнічаць у адпаведнасці з магчымасцямі і ідэямі з мэтай пераўтварэння іх у каштоўнасці для іншых. Яна заснавана на творчасці, крытычным мысленні і рашэнні праблем, праяўленні ініцыятывы і настойлівасці, здольнасці супрацоўнічаць з мэтай работы над праектамі, якія маюць культурную, сацыяльную або фінансавую каштоўнасць.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Прадпрымальніцкая кампетэнцыя – гэта разуменне таго, што існуюць розныя сітуацыі і магчымасці для рэалізацыі ідэй у асабістай, сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці і ўяўленне аб тым, як гэта адбываецца. Людзі павінны ведаць пра падыходы да планавання і кіравання праектамі, якім неабходны шматлікія рэсурсы. Важнымі з'яўляюцца веды пра эканоміку і сацыяльна-эканамічныя магчымасці, а таксама праблемы, якія могуць з'яўляцца ў кіраўніка, арганізацыі ці грамадства. Акрамя гэтага, існуюць яшчэ і этычныя прынцыпы і праблемы, звязаныя са свядомым асэнсаваннем уласных моцных і слабых бакоў.

### Навыкі

Прадпрымальніцкія здольнасці заснаваны на творчасці, якая ўключае ў сябе ўяўленне, стратэгічнае мысленне і рашэнне праблем, крытычны і канструктыўны аналіз у межах творчых працэсаў і ініцыятыў. Яны ўключаюць у сябе здольнасць працаваць як індывідуальна, так і ў камандзе, мабілізаваць рэсурсы і людзей для падтрымкі дзейнасці. Неад'емным навыкам з'яўляецца здольнасць прымаць фінансавыя рашэнні, якія тычацца кошту. І, нарэшце, уменне эфектыўна камунікаваць, весці перамовы, спраўляцца з сумневамі, неадназначнымі сітуацыямі і рызыкамі з'яўляецца важнай часткай прыняцця абгрунтаваных рашэнняў.

### Стаўленне

Прадпрымальніцкае стаўленне характарызуецца пачуццём ініцыятывы і дзейнасці, адданасці справе, доўгатэрміновай перспектыве, смеласці і настойлівасці ў дасягненні мэт. Яны ўключаюць у сябе жаданне матываваць іншых і паважаць іх ідэі, суперажываць і клапаціцца пра іншых людзей і навакольнае асяроддзе, асэнсоўваць этычную адказнасць на працягу ўсяго працэсу.



# Дасведчанасць і здольнасць выяўляць сябе ў культурнай сферы



**Кампетэнцыі ў культурнай дасведчанасці і самавыяўленні прадугледжваюць павагу і разуменне таго, што з дапамогай творчасці праяўляюцца ідэі і сэнс, як яны ўзаемадзейнічаюць з рознымі культурамі і ў якіх мастацкіх і культурных формах яны праяўляюцца. Наяўнасць гэтай кампетэнцыі азначае актыўны ўдзел у разуменні, развіцці і выражэнні ўласных ідэй, у асэнсаванні свайго месца і ролі ў розных сферах грамадскай дзейнасці.**

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да гэтай кампетэнцыі

### Веды

Гэта кампетэнцыя грунтуецца на ведах пра мясцовую, нацыянальную, рэгіянальную, еўрапейскую і сусветную культуру і яе праяўленні, у тым ліку мову, спадчыну, традыцыі, культурныя прадукты, і як яны могуць уплываць адны на другія, а таксама на пачуцці чалавека. Пры гэтым падаецца важным разумець, што існуюць розныя спосабы ўзаемадзеяння творчых ідэй са стваральнікам, удзельнікам і гледачом у межах пісьмовых, друкаваных і лічбавых тэкстаў, а таксама ў такіх мастацкіх формах, як тэатр, кіно, танец, відэагульні, жывапіс і дызайн, музыка, традыцыйнае мастацтва, архітэктура і мастацтва ў змешаных формах. Чалавеку неабходна разумець, як развіваецца яго ўласная ідэнтычнасць і культурная спадчына ў межах сусветнай культурнай разнастайнасці і мець уяўленне аб тым, як мастацтва і формы культуры могуць быць сродкамі пазнання свету.

### Навыкі

Навыкі для гэтай кампетэнцыі складаюцца са здольнасці выказваць і інтэрпрэтаваць вобразныя і абстрактныя ўяўленні, перажыванні і эмоцыі з эмпатыяй у дачыненні да розных мастацкіх і культурных форм. Уменне ўсведамляць магчымасці для асабістых, сацыяльных або камерцыйных мэт праз мастацтва і культуру, а таксама магчымасці для ўдзелу ў індывідуальных і калектыўных творчых праектах – яшчэ адзін важны навык для гэтай кампетэнцыі.

### Стаўленне

Вельмі важна адкрыта, станоўча і з павагай ставіцца да разнастайнасці розных праяўленняў культуры, мець этычны і адказны падыход да інтэлектуальнай і культурнай уласнасці. Станоўчае стаўленне таксама праяўляецца ў зацікаўленасці светам, у свабодным бачанні новых магчымасцей і ў жаданні набываць культурны вопыт.

# Падтрымка развіцця ключавых кампетэнцый

Кожны чалавек мае магчымасці для развіцця ключавых кампетэнцый дзякуючы высакаякаснай і інклюзіўнай адукацыі, выкладанню і навучанню на працягу ўсяго жыцця.
Адукацыя, выкладанне і навучанне на працягу ўсяго жыцця, якія з'яўляюцца кампетэнтнасна-арыентаванымі ў сферы выкладання і навучання, ставяць перад сабой мэту развіцця ключавых кампетэнцый, улічваючы пры гэтым адпаведныя веды, навыкі і стаўленні. Для таго, каб лепш зразумець, можна зрабіць параўнанне з выкладаннем і навучаннем, якія заснаваны на набыцці ведаў, дзе веды з'яўляюцца галоўнай мэтай.

Эфектыўныя практыкі, якія заснаваны на развіцці ключавых кампетэнцый, маюць станоўчыя вынікі ў наступных сферах:

> падыходы да выкладання і навучання і навучальнае асяроддзе;;

> падтрымка педагагічных кадраў;

> ацэньванне і праверка кампетэнцый.

# Падыходы да выкладання і навучання і навучальнае асяроддзе

Кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы, якія заснаваны на праектных, мастацкіх, даследчых, эксперыментальных метадах і навучанні праз дзейнасць, паляпшаюць эфектыўнасць навучання і спрыяюць вучэбнай матываванасці. У той жа час яны ствараюць умовы для інавацый, супрацоўніцтва і міждысцыплінарнага навучання, яны аддаюць прыярытэтную ролю вучням і матывуюць іх да актыўнай дзейнасці. Напрыклад, лічбавыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў праектным навучанні, спрыяюць павышэнню эфектыўнасці навучальнага працэсу і развіваюць лічбавыя кампетэнцыі. У спалучэнні з сацыяльным і эмацыянальным навучаннем і здароўезберагальнай фізічнай актыўнасцю, кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы павялічваюць агульную вучэбную матывацыю вучняў, іх вынікі і актыўны ўдзел.

Кампетэнцыі развіваюцца найбольш эфектыўна, калі навучанне адбываецца ў розных навучальных асяроддзях. Супрацоўніцтва паміж зацікаўленымі бакамі фармальнай і нефармальнай адукацыі і далучэнне да іх працадаўцаў і партнёраў з мясцовых арганізацый, не звязаных з адукацыяй, з'яўляецца вельмі важным фактарам.

Такое супрацоўніцтва можа спрасціць пераход ад адукацыі да працаўладкавання і, наадварот, падтрымлівае цесную сувязь паміж ведамі і жыццёвымі патрэбамі

Напрыклад, шматмоўная кампетэнцыя можа развівацца ў цесным супрацоўніцтве з рознымі зацікаўленымі бакамі за мяжой і ў спалучэнні з мабільнасцю педагогаў і навучэнцаў. Супрацоўніцтва з зацікаўленымі бакамі ў галіне мастацтва і правядзенне ўрокаў у музеях можа быць карысным для культурнай дасведчанасці і самавыяўлення. Магчымасці для атрымання вопыту прадпрымальніцкай дзейнасці, стажыроўкі ў кампаніях або наведванні прадпрымальнікамі навучальных устаноў карысныя як для моладзі, так і для дарослых.
Кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы ў выкладанні і навучанні, супрацоўніцтва з зацікаўленымі бакамі і навучанне, якое адбываецца ў розных асяроддзях, – усё гэта спрыяе развіццю ключавых кампетэнцый.

# Падтрымка педагагічных кадраў

Педагагічны састаў аказвае вырашальны ўплыў на дасягненні і матывацыю вучняў, а значыць, і на развіццё іх кампетэнцый. У той самы час падыходы да выкладання і навучання, якія грунтуюцца на развіцці кампетэнцый, патрабуюць больш якаснай падрыхтоўкі ад педагогаў.
Такім чынам, кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы павінны быць уключаны ў пачатковую падрыхтоўку педагагічных кадраў і іх далейшае прафесійнае развіццё. У сваю чаргу педагогам неабходна падтрымка ва ўдасканаленні кампетэнтнасна-арыентаваных падыходаў і таксама матывацыя да супрацоўніцтва ўнутры сваіх навучальных установаў і за іх межамі.

Гэта можа быць магчымым дзякуючы ўзаемнаму навучанню, абмену педагагічнымі кадрамі, мабільнасці, сеткаваму ўзаемадзеянню і стварэнню прафесійных суполак.
Доступ да экспертных цэнтраў і апошніх даследаванняў, наяўнасць неабходных дапаможнікаў і матэрыялаў у спалучэнні з рознымі варыятыўнымі магчымасцямі і аўтаномнасцю ў арганізацыі навучання павышаюць якасць выкладання.
Усе гэтыя падыходы спрыяюць развіццю вучнёўскіх кампетэнцый.

# Ацэньванне і праверка кампетэнцый

Ацэньванне ўплывае на людзей і іх вынікі навучання. Яно можа дапамагчы ў атрыманні і выкарыстанні новых ведаў і навыкаў, а таксама даць магчымасць навучэнцам зразумець найлепшыя для іх стылі навучання, стаць больш аўтаномнымі і ўпэўненымі ў навучанні. Праверка і ацэньванне кампетэнцый дапамагаюць навучэнцу ў пошуку магчымасцей для далейшага навучання ці працаўладкавання.

Улічваючы гэта, вельмі важна ствараць інструментарый і розныя падыходы, якія будуць ацэньваць ступень развіцця тых ці іншых кампетэнцый. Апісанне ключавых кампетэнцый і іх дэталёвы перавод у структурныя мадэлі вынікаў навучання, такіх як кампетэнцыі прадпрымальніцтва і Рамкі лічбавай кампетэнтнасці, у спалучэнні з дыягнастычным, фарміруючым і выніковым ацэньваннем, спрыяюць гэтаму працэсу.

Лічбавыя тэхналогіі могуць дапамагчы ў вымярэнні дасягненняў вучняў, напрыклад, ужо існуючыя інструменты для праверкі нефармальных і нетрадыцыйных форм адукацыі, такія, як Europass і Youthpass.

Навучанне, выкладанне і ацэньванне цесна звязаны паміж сабою, і любыя змены ці стратэгіі, якія будуць уплываць на адно з іх, у сваю чаргу будуць уздзейнічаць і на іншыя. Гэта азначае, што рашэнні, якія прымаюцца ў дачыненні да ацэньвання, звязаны з працэсам выкладання і навучання.

## Getting in touch with the EU

### In person

All over the European Union there are hundreds of Europe Direct information centres. You can find the address of the centre nearest you at: https://europa.eu/european-union/contact_en

### On the phone or by email

Europe Direct is a service that answers your questions about the European Union. You can contact this service:

– by freephone: 00 800 6 7 8 9 10 11 (certain operators may charge for these calls),

– at the following standard number: +32 22999696 or

– by email via: https://europa.eu/european-union/contact_en

## Finding information about the EU

### Online

Information about the European Union in all the official languages of the EU is available on the Europa website at: https://europa.eu/european-union/index_en

### EU publications

You can download or order free and priced EU publications at: https://publications.europa.eu/en/publications. Multiple copies of free publications may be obtained by contacting Europe Direct or your local information centre (see https://europa.eu/european-union/contact_en).

### EU law and related documents

For access to legal information from the EU, including all EU law since 1952 in all the official language versions, go to EUR-Lex at: http://eur-lex.europa.eu

### Open data from the EU

The EU Open Data Portal (http://data.europa.eu/euodp/en) provides access to datasets from the EU. Data can be downloaded and reused for free, for both commercial and non-commercial purposes.

NC-02-19-150-EN-N

Publications Office
of the European Union

ISBN 978-92-76-00476-9
doi:10.2766/569540